Programmatic Cooperation Framework for
Armenia, Azerbaijan, Georgia, Republic of Moldova, Ukraine and Belarus

Funded by the European Union and the Council of Europe — EUROPEAN UNION — COUNCIL OF EUROPE / CONSEIL DE L'EUROPE — Implemented by the Council of Europe

# Сярэднетэрміновыя вынікі праектаў, ажыццяўляемых у Беларусі ў рамках механізма праграмнага супрацоўніцтва Рады Еўропы/Еўрапейскага Саюза (2015-2017 гг.)

## Што такое механізм праграмнага супрацоўніцтва?

У красавіку 2014 года Еўрапейскі Саюз (Еўрасаюз) і Рада Еўропы дамовіліся аб рэалізацыі мэтавых мерапрыемстваў па развіцці супрацоўніцтва з **краінамі Ўсходняга партнёрства** Еўрасаюза, каб наблізіць іх да еўрапейскіх стандартаў у галінах правоў чалавека, дэмакратыі і вяршэнства закона. Рэгіянальныя праекты ў рамках «механізма праграмнага супрацоўніцтва» (МПС) у 2015-2017 гадах фінансуюцца ў першую чаргу Еўрасаюзам, а таксама суфінансуюцца і ажыццяўляюцца Саветам Еўропы.

У дадатак да ўдзелу ў 13 рэгіянальных праектах, **існуюць два праекты па канкрэтнай краіне Беларусі** з **бюджэтам у 215 000 еўра.**

## Садзейнічанне далучэнню Беларусі да Еўрапейскай хартыі рэгіянальных моў або моў меншасцяў

Бюджэт праекта складае 115 000 еўра.

Былі праведзены круглыя сталы для прадстаўнікоў нацыянальных органаў і нацыянальных меншасцяў па пытаннях еўрапейскай найлепшай практыкі ў галіне прасоўвання моў меншасцяў. Уладныя органы атрымалі юрыдычныя кансультацыі каб дапамагчы вызначыць меры, названыя ў Хартыі, якія найбольш адаптаваныя да моў меншасцяў Беларусі. Інфармацыйныя матэрыялы зараз друкуюцца з мэтай павышэння дасведчанасці аб Хартыі сярод уладаў і нацыянальных меншасцяў.

## Эфектыўнае кіраванне і барацьба з карупцыяй

Бюджэт складае 100 000 еўра.

Рада Еўропы правяла вучобу і кансультаванне прадстаўнікоў дзяржаўнага сектара Беларусі па лепшай ацэнцы агульных і галіновых карупцыйных рызык. Акрамя таго, пракуроры і следчыя навучыліся расследваць складаныя эканамічныя злачынствы з удзелам юрыдычных асобаў. У рамках рэгіянальнай ініцыятывы падтрымка таксама будзе аказана Беларусі ў выяўленні карупцыйных рызык у галіне адукацыі.

**Дадатковая інфармацыя**: eap-pcf-eu.coe.int

**Кантактная асоба:** Таццяна Баева, прэс-сакратар/супрацоўнік па сувязях з СМІ, +33 685 11 64 93
**Кастрычнік 2016 г.**